БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№6 (289)
чэрвень 2026

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”

У НУМАРЫ:

На Паўночных могілках у Мінску адкрылі помнік акадэміку Радзіму Гарэцкаму

22 чэрвеня, роўна праз год пасля смерці акадэміка Радзіма Гарэцкага, на ягонай магіле на мінскіх Паўночных могілках урачыста адкрылі надмагільны помнік яму. Фота помніка з’явілася ў сацсетках.

Старонка 2

У ПОЛЬШЧЫ ПРАЙШОЎ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫІ SONCAHRAJ

Фестываль SONCAHRAJ традыцыйна адбыўся на Беласточчыне ў дзвюх лакацыях. Ён пачаўся 12 чэрвеня на рынку Касцюшкі ў Беластоку.

У гэты дзень выступілі жаночы спеўны гурт BARVY (Гданьск), мужчынскі гурт KASARY (Варшава), танцавальны гурт дзяцей і моладзі PADLASKI WIANOK (Беласток).

13 чэрвеня свята працягнулася ў вёсцы Вілюкі (гміна Дубічы-Цэркеўне). Сярод запрошаных гасцей былі BARVY (Гданьск), KASARY (Варшава), студыя фальклору падляшскіх беларусаў ŻEMERWA (Студзіводы).

У праграме фэсту – жывая інструментальная музыка, традыцыйныя спевы і супольны спеўны сход, а таксама – танцавальныя варштаты ды патанцоўкі.

Фестываль беларускай традыцыі SONCAHRAJ прэзентуе аўтэнтычныя беларускія гурты, а таксама розныя актыўнасці – традыцыйныя беларускія танцы і супольныя спевы. Ён ствараўся фондам TUTAKA з адмысловай мэтай – развіваць сапраўдную, несцэнічную беларускую культуру.

reform.news

НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ

навіны

НА ПАЎНОЧНЫХ МОГІЛКАХ У МІНСКУ АДКРЫЛІ ПОМНІК АКАДЭМІКУ РАДЗІМУ ГАРЭЦКАМУ

22 чэрвеня, роўна праз год пасля смерці акадэміка Радзіма Гарэцкага, на ягонай магіле на мінскіх Паўночных могілках урачыста адкрылі надмагільны помнік яму. Фота помніка з'явілася ў сацсетках.

На ўрачыстае адкрыццё помніка сабраліся каля 40 чалавек. Яго аўтар – вядомы скульптар Ігар Засімовіч, у аснове – валун з Браслаўскага краю.

Радзім Гарэцкі пражыў вельмі доўгае, 96-гадовае жыццё, на працягу якога заўсёды імкнуўся служыць сваёй радзіме і свайму народу, хоць воляй лёсу некалькі дзесяцігоддзяў быў вымушаны правесці за межамі бацькаўшчыны.

Нарадзіўся Радзім Гарэцкі 7 снежня 1928 года ў Менску, у сям'і Гаўрылы Гарэцкага, аднаго з заснавальнікаў і першых правадзейных членаў Беларускай акадэміі навук, і Ларысы Гарэцкай (у дзявоцтве Парфяновіч). Ён пляменнік Максіма Гарэцкага, беларускага пісьменніка.

Праз рэпрэсіі супраць сям'і Радзім правёў дзяцінства ў Расіі, дзе ў 1952 годзе скончыў Маскоўскі нафтавы інстытут і пасля больш за 20 гадоў адпрацаваў у Геалагічным інстытуце АН СССР. Толькі ў 1971 годзе ён вярнуўся на радзіму, дзе з 1977 па 1993 год узначальваў Інстытут геахіміі і геафізікі, у 1992-1997 гадах быў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі.

Радзім Гарэцкі стаў адным з заснавальнікаў сучаснай беларускай школы тэктонікі, яго даследаванні дапамаглі адкрыць шматлікія радовішчы карысных выкапняў, за што ён быў ушанаваны Дзяржаўнымі прэміямі СССР і Беларусі.

Акрамя навукі, ён актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю, узначальваў Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" і напісаў шэраг мастацка-дакументальных кніг пра гісторыю свайго роду і рэпрэсаваную беларускую інтэлігенцыю. У кнізе "Ахвярую сваім "я"… (Максім і Гаўрыла Гарэцкія)" (1998) Радзім Гарэцкі апісаў трагічны лёс сваіх блізкіх.

Ён усімі сіламі падтрымаў рух за незалежнасць Беларусі і дапамагаў станаўленню грамадзянскай супольнасці Беларусі. З 1993 года ён стаў прэзідэнтам Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Радзім Гарэцкі дажыў да пратэстаў 2020 года і звязаных з імі рэпрэсій, і ў верасні таго года ў інтэрв'ю газеце "Народная Воля" расказаў, якія пачуцці перажываў у сувязі з гэтым:

"З аднаго боку, мне вельмі балюча на ўсё гэта глядзець. Па мірным Мінску ездзяць бронетранспарцёры, аўтазакі, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны аплецены калючым дротам, як у вайну! Улада неяк неадэкватна ўспрымае сітуацыю. Па вуліцах жа мірны народ ідзе. Людзі так і кажуць: мы выйшлі на мірнае шэсце! За што іх дубасіць? Навошта Лукашэнка аддаў такі загад сваім падначаленым? Колькі ўжо збітых, колькі пакалечаных і параненых, ёсць ужо і забітыя. Жудасныя рэчы…

З другога боку, я проста шчаслівы, што дажыў

да гэтага часу, калі нарэшце прачнуўся ўвесь беларускі народ. І адчуў сваю моц, зразумеў, што хоча жыць у незалежнай і дэмакратычнай беларускай дзяржаве. Калі я бачу мора бел-чырвона-белых сцягоў, мая душа радуецца".

nashaniva.com

МІРАСЛАВУ ЛАЗОЎСКАМУ ХОЧУЦЬ НАДАЦЬ ЗВАННЕ ГАНАРОВАГА ГРАМАДЗЯНІНА РОЎНА

У Роўне 10 чэрвеня адкрылася выстава "Гісторыя беларускага супраціву", арганізаваная дабрачынным фондам "Вільна Білорусь". Экспазіцыя прысвечаная барацьбе беларусаў за свабоду і незалежнасць, а таксама сучаснаму супрацьстаянню расійскай агрэсіі і дыктатуры.

Кіраўнік грамадскага саюза "Білоруська спільнота України" Аляксей Францкевіч падкрэслівае, што выстава мае не толькі гістарычнае значэнне, але і дае магчывасць распавесці ўкраінцам пра беларусаў і Беларусь: "У зале былі прафесары, з адукацыі журналісты, пыталіся: ці цяжка сёння журналістам у тых умовах выконваць сваю працу ў Беларусі? Яны нават не ведаюць, што ў Беларусі няма незалежнай журналістыкі. Зараз распаўсюджваецца інфармацыя, што з тэрыторыі Беларусі зноўку рыхтуецца наступ. Гэта таксама вельмі шмат каго тут турбуе".

Напярэдадні выставы прадстаўнікі беларускай супольнасці разам з роднымі Мірослава Лазоўскага ўсталявалі беларускі бел-чырвона-белы сцяжок на яго банеры на Алеі Славы ў Роўне.

Кажа Аляксей Францкевіч: "Гэта зрабіў сын пляменніцы, які вельмі любіць Мірослава. Для іх гэта вельмі важна. Лазоўскі – сучасны беларускі нацыянальны герой. Чалавек, які вельмі шмат зрабіў для Беларусі. Амаль ва ўсіх значных падзеях ён браў удзел".

Таксама грамадскі саюз "Білоруська спільнота України" накіраваў у Роўненскую гарадскую раду зварот аб прысваенні Мірославу Лазоўскаму звання ганаровага грамадзяніна Роўна.

Акрамя таго, беларускія актывісты працуюць над адкрыццём у Роўне прадстаўніцтва "Білоруської спільноти України".

racyja.com

навіны

ПАВЕЛ СЕВЯРЫНЕЦ ПРЭЗЕНТАВАЎ СВАЮ КНІГУ Ў ВІЗІТ-ЦЭНТРЫ СЕЙМА ЛІТВЫ

"Беларусь – гэта святое" – у візіт-цэнтры Сейма Літвы ў Вільні 23 чэрвеня прайшла прэзентацыя кнігі пісьменніка і палітыка Паўла Севярынца. На імпрэзу завіталі сябры і знаёмыя Паўла, журналісты, былыя палітвязні, святары, а таксама літоўскія дэпутаты Жыгімантас Павілёніс і Русланас Баранавас.

Паводле Паўла Севярынца, прэзентацыя прайшла ў няпросты час, але ён быў вельмі рады бачыць у візіт-цэнтры вялікую грамаду беларусаў:

– Адбываецца гэтая сустрэча ў вырашальныя часы, таму што неўзабаве завершыцца ўльтыматум Зяленскага, а Лукашэнка сабраўся ў доўгую камандзіроўку кудысьці ўдалечыню. Вельмі можа быць, што нас чакаюць вырашальныя выпрабаванні і змены. Галоўнае, каб не было вайны. Для беларусаў зараз гэта вельмі актуальна, мы як ядзерная мішэнь, гэта вельмі кепска, калі ў Беларусі пачнецца гарачая вайна.

Як кажа вядоўца імпрэзы і сябра Паўла Барыс Гарэцкі, ён рады таму, што змог паўдзельнічаць у падрыхтоўцы і прэзентацыі гэтай кнігі:

– Для мяне гэтая кніга – сведчанне стойкасці Паўла. Ён цярпеў вельмі моцны пераслед. Сядзеў з людзьмі, якія максімальна неадэкватныя. Яго саджалі з людзьмі, якія проста выводзілі яго з сябе ў гарадзенскай турме. Расказваў, што гэта было проста псіхалагічнае выпрабаванне. Па-першае, людзі на яго стукалі, пастаянна пісалі на яго розныя "малявы". І знаходзячыся ў такіх умовах, ён піша вершы, малюе малюнкі, піша кнігі. Наступная кніга наперадзе.

Кніга "Беларусь – гэта святое" складаецца з 22 вершаў, 71 малюнка беларускіх храмаў і 71 выслоўя.



Прэзентацыі гэтай кнігі раней ужо адбыліся ў Варшаве, Беластоку і Лондане.

racyja.com

Дзённік Юркі Хмялеўскага: "CZASOPIS" У БЕЛАРУСКІМ ХАБЕ Ў БЕЛАСТОКУ

З сябрамі з рэдакцыі "Часопіса" – Мірай і Тамашом – правялі мы надта сімпатычную сустрэчу ў беластоцкім хабе "Новая зямля". Было гэта ў 10 траўня, калі заходзіць туды шмат людзей. Галоўным чынам сустракаюцца там прыезджыя беларусы, што апынуліся ў Беластоку, найбольш пасля вядомых падзей з 2020 г. Для іх, распыленых па горадзе, такое месца вельмі патрэбнае. Тут адбываюцца розныя сустрэчы, арганізуюцца таксама заняткі для дзяцей. Дзейнасцю хабу ўмела заводзіць яго кіраўнік Надзея Салаўёва.

З Уладзімірам Арловым у хабе „Новая зямля" ў Беластоку. Фота Міры Лукшы

І менавіта з ёю Тамаш дамовіўся, каб у хабе правесці сустрэчу з людзьмі з дыяспары і расказаць ім пра наш штомесячнік, заахвоціць яго чытаць і дасылаць нам матэрыялы для публікацыі. Ад некалькі месяцаў заносім туды дзясятак экзэмпляраў кожнага нумару. Бясплатна, у рамках прамоцыі. І гэта запрацавала, бо наведнікі пацікавіліся нашым выданнем. Даволі цяжка, пэўна, чытаць ім у "Часопісе" тэксты па-польску, зручней, вядома, па-беларуску. А такіх артыкулаў у нас шмат і нават ёсць пастаянная рубрыка "Людзі дыяспары".

Калі з Мірай з'явіліся мы ў хабе, Тамаш быў ужо на месцы. Прыйшлося амаль паўгадзіны пачакаць, бо ў хабе было шмат людзей, якія жыва з сабой размаўлялі, нават спрачаліся. Толькі што закончылася нейкая сустрэча палітычнага характару ў сувязі з выбарамі на наступным тыдні ў Каардынацыйную раду. Многія спяшаліся дамоў, бо былі крыху стомленыя пасля спрэчак, а заўтра ж трэба было ісці на працу. Частка аднак засталася, больш за дзясятак асоб.

Спачатку выступіў Тамаш, які коратка расказаў прысутным пра нашае выданне. Згадаў пра яго ўнікальны характар – разнамоўе і даволі высокі інтэлектуальны ўзровень, нягледзячы на вельмі сціплыя фінансавыя і арганізацыйныя магчымасці. Сябра звярнуў увагу, што падобнага выдання ў Беларусі няма і не было. У сённяшняй сітуацыі наогул гэта немагчымае з увагі найперш на некаторыя тэмы і праблемы ў артыкулах, якія не супадаюць, мякка кажучы, з дзеяннямі цяперашняй нелегітымнай дэмакратычнай улады.

Затым я коратка расказаў пра генезіс і гісторыю нашага штомесячніка. Растлумачыў таксама загаловак, які ў нашым беларуска-польскім свеце не гучыць банальна, толькі даслоўна як запіс часу. Нашага і тут ад многіх нават стагоддзяў.

Хаця "Часопіс" выходзіць ужо трыццаць шосты год, амаль усе ўдзельнікі сустрэчы наогул пра яго яшчэ не чулі або даведаліся зусім нядаўна. Нават пра наш багаты сайт Czasopis.pl. Дарэчы, мяне гэта не здзівіла, бо тыя людзі крыху быццам з іншага свету. Калі жылі яшчэ ў Беларусі, многія з іх нават не ведалі, што па-за межамі, на Беласточчыне, жывуць карэнныя беларусы, якія маюць нават сваю прэсу. Там пра такое не вучаць у школах, не паказваюць па тэлевізары і амаль не пішуць у газетах. Такая вось палітыка дзяржавы. Не памянялася яна яшчэ з савецкіх часоў. Пра нас ведаюць толькі тыя, што з беларускай меншасцю ў Польшчы мелі або маюць сямейныя і сяброўскія кантакты, нейкую сувязь. Перад усім на культурніцкай, навуковай ці грамадскай ніве.

Таму прысутным у хабе, як я заўважыў, цікава было даведацца, што кожны месяц у "Часопісе" публікуецца аб'ёмістая хроніка як дакумент перадусім жыцця беларускай меншасці. Міра дапоўніла яшчэ мой аповед рэфлексіямі пра штотыднёвік "Ніва", які выходзіць удвая даўжэй, бо з 1956 года (нядаўна, у лютым – сакавіку, быў юбілей 70-годдзя). А "Часопіс" вырас менавіта з "Нівы".

Мне як галоўнаму рэдактару вельмі залежыць, каб мець чытачоў таксама ў гэтым асяроддзі. Таму падчас сустрэчы хацеў я пачуць прапановы тэм, якія асабліва іх маглі б зацікавіць. На жаль, не надта з гэтым атрымалася. Большую цікавасць выклікала мая прапанова дасылаць у наш штомесячнік тэксты для публікацыі. Тым больш, што сярод прысутных былі асобы, якія займаюцца літаратурнай ці публіцыстычнай творчасцю. У тым ліку знакаміты вядомы аўтар Уладзімір Арлоў, які і адгукнуўся на маю прапанову, дасылаючы фрагмент свайго рамана, які апублікуем ужо ў наступным летнім выпуску.

Юрка Хмялеўскі, czasopis.pl

навіны

БЕЛАРУСКІЯ КРЫЖЫ Ў МІДЛЭНДЗЕ: ПАМЯЦЬ, ВЕРА І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ГОДНАСЦЬ

14 чэрвеня 2026 года беларусы правінцыі Антарыя ў Канадзе здзейснілі традыцыйную вандроўку да Беларускіх крыжоў у Прошчы Пакутнікаў у Мідлэндзе, што непадалёк ад возера Гурон, аднаго з Вялікіх азёр Паўночнай Амерыкі.

Гэтае месца для беларусаў Канады ўжо даўно стала не проста пунктам штогадовай пілігрымкі. Гэта месца памяці, малітвы, нацыянальнага сведчання і духоўнай еднасці.

Прошча Пакутнікаў – Святыня Канады і месца памяці народаў

Гісторыя яе сягае XVII стагоддзя, калі на землі Гуроніі прыйшлі першыя езуіцкія місіянеры з Еўропы. Яны працавалі сярод карэнных народаў, неслі хрысціянства і ўрэшце прынялі пакутніцкую смерць у часе драматычных падзей міжплемянных войнаў. Пазней каталіцкі касцёл прызнаў іх Святымі Пакутнікамі, а гэтае месца стала адной з найбольш вядомых хрысціянскіх святынь Канады. Штогод яго наведваюць звыш ста тысяч чалавек.

Дамінанта Прошчы – Касьцёл Езуітаў

Але Мартыйрз-Шрайн – гэта не толькі Каталіцкая прошча. Гэта таксама вялікая прастора памяці народаў, якія стварылі сучасную Канаду. На яе тэрыторыі знаходзяцца дзясяткі нацыянальных крыжоў, скульптурных кампазіцый і памятных знакаў. Яны нагадваюць, што Канада – краіна імігрантаў, дзе прадстаўнікі розных народаў, моў і рэлігій могуць захоўваць сваю спадчыну, не губляючы пры гэтым агульнага пачуцця прыналежнасці да канадскай дзяржавы.

Беларускі крыж і Курапацкі знак

Беларускі крыж быў урачыста адкрыты ў 1988 годзе ў адзначэнне 1000-годдзя хрысціянства ў Беларусі. Ён быў усталяваны дзякуючы ахвяраванням беларусаў з усяго свету – з Канады, Злучаных Штатаў, Вялікай Брытаніі, Аўстраліі і іншых краін.

Крыж быў асвечаны Апостальскім Візітатарам для Беларусаў айцом Аляксандрам Надсанам. Падчас адкрыцця выступалі старшыня Рады БНР Язэп Сажыч, прадстаўнікі беларускай дыяспары, славутая паэтка Наталля Арсеннева. Сімвалічна, што на Мемарыяльнай дошцы Крыжа змешчаныя радкі з яе верша “Малітва”, які сёння беларусы ведаюць як духоўны гімн нацыі – “Магутны Божа”.

Побач з Беларускім крыжам знаходзіцца яшчэ адзін надзвычай важны для беларусаў памятны знак – крыж у памяць ахвяр камуністычнага тэрору ў Беларусі. Ён быў усталяваны ў 1994 годзе, праз шэсць гадоў пасля адкрыцця праўды пра Курапаты, калі дзякуючы Зянону Пазьняку і ягоным паплечнікам свет даведаўся пра адзін з самых жудасных сімвалаў савецкага генацыду на нашай зямлі.

Гэты крыж стаў адным з першых у Канадзе адмысловых памятных знакаў, прысвечаных ахвярам камуністычных рэпрэсій. Беларусы ўшанавалі сваіх забітых тады, калі маштабы трагедыі яшчэ далёка не былі поўнасцю асэнсаваныя. На дошцы ўзгадваліся сотні тысяч ахвяр. Сёння ж у беларускай дыяспары ўсё часцей гавораць пра значна большыя страты – пра 1,8–1,9 мільёнаў людзей, знішчаных камуністычнай сістэмай у мірны час, у 1920–30-я і паваенныя гады.

Таму для беларусаў Мідлэнд – гэта месца двух Крыжоў. Адзін нагадвае пра тысячагадовую хрысціянскую традыцыю Беларусі. Другі – пра Курапаты, пра забітых, пра тых, хто стаў ахвярай расійска-бальшавіцкага тэрору на беларускай зямлі.

Ля гэтага знаку, як і кожны год, былі запаленыя знічкі. Побач стаялі беларускі і канадскі сцягі. Гэта была даніна памяці ўсім беларусам, якія загінулі за волю, годнасць і незалежнасць Бацькаўшчыны.

Пад бел-чырвона-белымі сцягамі

Нягледзячы на дождж, шмат беларусаў прыехала на ўрачыстасць, над калонай луналі бела-чырвона-белыя сцягі. Крыжы былі аздобленыя ручнікамі, кветкамі і вялікім нацыянальным сцягам, які стаў урачыстым фонам усёй сустрэчы.

Прадстаўнік адміністрацыі прошчы, які дапамагаў усталёўваць намёты, сталы і крэслы, прызнаўся, што кожны год чакае моманту, калі беларусы ўздымаюць каля свайго крыжа вялікі бел-чырвона-белы сцяг. Гэтае спалучэнне колераў, паводле ягоных словаў, заўсёды робіць беларускую прысутнасць асабліва выразнай.

Побач, каля свайго крыжа, у той самы дзень маліліся і спявалі славакі. Гэта было прыгожае сведчанне таго, як у Канадзе розныя народы захоўваюць сваё – сваю веру, сваю памяць, сваю песню, свой сцяг. Беларусы ў гэтай вялікай канадскай традыцыі стаяць на роўных з іншымі народамі.

Слова пра гісторыю і змаганне

Святар БАПЦ іерэй а. Вячаслаў прачытаў малітву за Беларусь.

Перад прысутнымі выступіў старшыня Парафіяльнай рады царквы святога Кірылы Тураўскага (БАПЦ) у Таронта Зміцер Эльяшэвіч. Ён нагадаў, што традыцыя вандровак да Беларускага крыжа была закладзеная старэйшым пакаленнем беларускай эміграцыі. Сённяшні абавязак – не даць гэтай традыцыі перарвацца і перадаць яе маладзейшым.

Сябра Управы Таронтаўскага аддзела Згуртавання беларусаў Канады Віталь Кашалёў у сваім слове звярнуўся да гісторыі беларускага збройнага змагання супраць бальшавізму. Ён узгадаў генерала Станіслава Булак-Балаховіча – аднаго з найбольш яскравых беларускіх вайсковых дзеячаў пачатку XX стагоддзя.

У 1920 годзе аддзелы Булак-Балаховіча дзейнічалі на беларускіх землях і ля мяжы з сучаснай Украінай, у тым ліку ў раёне Чарнобыля, дзе яны вялі баі з савецкімі войскамі. Гэта быў час, калі беларускі народ не прымаў бальшавіцкай навалы моўчкі. Ён адказваў супрацівам, зброяй, словам, народнай песняй і сатырай.

У народзе тады спявалі:

Едуць, едуць камуністы –
Усё так і свішча,
Хавай, баба, хлеб і сала,
Жыта на гарышча.
Цвіце, цвіце чарамшына,
А ў ёй балахоўцы.
Парубілі падразвёрстку
Маладыя хлопцы.
Бяжыць, бяжыць камуністы,
Ажно сэрца занялося.
Балаховец стрэльбу зняў –
І ўсё сканчалося.

Гэты фальклор быў не проста жартам. Гэта была памяць пра час, калі ў людзей адбіралі апошні хлеб, калі ў Беларусь прыйшла чужая ўлада і пачала ламаць жыццё народу. Таму згадка пра Булак-Балаховіча была не толькі гістарычнай даведкай. Гэта быў напамін: беларусы маюць сваю вайсковую гісторыю, сваіх герояў, сваю традыцыю змагання. І калі народ забываецца на сваіх змагароў, ён становіцца безабаронным перад чужой гістарычнай хлуснёй.

Нацыянальны суверэнітэт як умова жыцця

У сваім выступе сябра Канадскага сектару Рады БНР Алесь Кот падкрэсліў, што беларусам сёння недастаткова гаварыць толькі пра дзяржаўны суверэнітэт. Не менш важны – а ў пэўным сэнсе нават яшчэ больш важны – суверэнітэт нацыянальны. Бо дзяржава можа фармальна існаваць, але калі народ губляе мову, памяць, культуру і разуменне сваёй гісторыі, ён паступова губляе сябе. Тады чужая інфармацыйная прастора захоп-

лівае свядомасць людзей. Тады можа здарыцца самае страшнае: народ сам, праз уяўна дэмакратычную працэдуру, “добраахвотнае” рашэнне, аддасць сябе чужой імперыі.

Расія ўжо неаднойчы паглынала і асімілявала народы і землі. Дастаткова згадаць беларускія этнічныя абшары на Смаленшчыне, Браншчыне, Пскоўшчыне, дзе беларуская прысутнасць была амаль цалкам знішчаная русіфікацыяй. Тое самае можа здарыцца і з усёй Беларуссю, калі беларусы паступова згубяць свае мову, культуру, нацыянальную памяць. Менавіта таму беларуская мова, беларуская школа, беларуская кніга, беларускі сцяг, беларускі крыж, беларуская песня – гэта не дробязь і не фальклорная аздоба. Гэта лінія абароны. Гэта перашкода, якая не дазваляе нам праваліцца ў багну расейшчыны.

Кожны беларус, які гаворыць па-беларуску, чытае беларускую кнігу, прыводзіць дзяцей на беларускія імпрэзы, падтрымлівае беларускую царкву, арганізацыю ці культурную справу, кладзе свой каменьчык у агульны падмурак будучай Беларусі.

Прыезд Вольгі Іпатавай

Асаблівай і вельмі кранальнай падзеяй стала прысутнасць вядомай беларускай пісьменніцы Вольгі Іпатавай, якая ўжо блізу чвэрці стагоддзя жыве ў Канадзе. Пасля працяглай і цяжкай хваробы яна знайшла сілы прыехаць у Мідлэнд разам з сынам, доктарам Русланам Качатковым.

Для прысутных гэта стала прыемнай неспадзянкай. Сп. Вольга была ў цэнтры ўвагі, яе віталі, ёй дзякавалі, ёй радаваліся.

Падчас сустрэчы Алесь Кот уручыў ёй апублікаваную ў снежні 2025 года кнігу Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы “У восем год я была на вайне” з аўтарскім подпісам. Для Вольгі Іпатавай гэта быў нечаканы і вельмі дарагі падарунак. Яна сказала некалькі словаў, у якіх прагучала радасць ад таго, што беларуская мова і культура ў дыяспары не згасаюць. Яна гаварыла пра залатую нітку пераемнасці, якую трэба трымаць і перадаваць далей – ад пакалення да пакалення.

Гэтыя словы былі асабліва важныя. Бо перад прысутнымі стаяла не толькі вядомая пісьменніца, асоба, ў што ў свой час узначальвала Саюз беларускіх пісьменнікаў, але і чалавек, які сам шмат зрабіў для беларускай культуры і цяпер бачыць, што гэтая праца дала плён.

“Магутны Божа” над Прошчай

Завяршэннем урачыстай часткі стала супольнае выкананне гімна “Магутны Божа”. Гімн гучаў над дрэвамі, над крыжамі розных народаў, над святыняй, дзе памяць і вера злучаюцца ў адно. Словы гімну ёсць на Мемарыяльнай дошцы Крыжа.

У гэты момант асабліва выразна адчувалася: Беларусь жыве не толькі ў межах сваёй зямлі. Беларусь жыве ўсюды, дзе беларусы памятаюць, хто яны. Дзе яны гавораць сваёй мовай. Дзе яны моляцца за Бацькаўшчыну. Дзе ўздымаюць свой сцяг і перадаюць дзецям праўду пра свой народ.

Пасля малітвы, выступаў і спеваў удзельнікі сабраліся за сяброўскім сталом, рупліва падрыхтаваным Парафіяй святога Кірылы Тураўскага ў Таронта. Сала, каўбаскі, чорны жытнёвы хлеб, зялёная цыбуля, агуркі, памідоры, гарбата і шчырыя размовы зрабілі гэты дзень яшчэ цяплейшым, нягледзячы на дождж.

Беларускія Крыжы ў Мідлэндзе ўжо дзесяцігоддзямі яднаюць беларусаў розных пакаленняў, розных канфесій і розных жыццёвых шляхоў. Тут разам стаяць праваслаўныя, рыма-каталікі, грэка-каталікі, пратэстанты. Тут няма падзелу паводле таго, хто як жагнаецца. Тут усе – беларусы.

І таму кожны год па канадскіх дарогах зноў едуць аўтамабілі ў кірунку Мідлэнда. Едуць людзі, каб стаць пад Беларускім крыжам і Курапацкім знакам, запаліць знічку, памаліцца за Беларусь, сустрэць сваіх і яшчэ раз сказаць: мы ёсць, мы памятаем, мы працягваем.

Зміцер Эльяшэвіч

Алесь Кот

Вольга Іпатава

Бо пакуль жыве нацыянальная памяць – жыве народ.

А пакуль жыве беларускі народ – будзе жыць Беларусь.

Алесь Кот, belarus-news.us

юбілей

“АНГЕЛЬСКІ БЕЛАРУС”. 4 ФАКТЫ ПРА АРНОЛЬДА МАКМІЛІНА, ЯКІ ЎСЁ ЖЫЦЦЁ СЛУЖЫЦЬ БЕЛАРУШЧЫНЕ

21 чэрвеня знаны ангельскі мілоснік і зацяты абаронца беларушчыны прафесар Арнольд Макмілін святкуе 85-годдзе. На жаль, апошнім часам стан здароўя беларусіста цяжка назваць добрым, але Арнольд трымаецца і здзіўляе сваімі здаўна вядомымі аптымізмам і гумарам. У звязку з юбілеем хацелася б прыгадаць асноўныя вехі з беларусісцкага даробку лонданскага прафесара, які трапіў пад няўмольны шарм беларушчыны, пры гэтым надаўшы ёй непаўторных ангельскіх нотак.

Факт №1. Выбраў беларусістыку, каб разбіць манаполію русістыкі

Свой шлях у беларусістыцы Арнольд Макмілін пачаў як даследнік беларускай мовы XIX стагоддзя: *The Vocabulary of the Byelorussian Language in the 19th Century (London, 1971)*. З гэтай публікацыі А. Макмілін выкарыстоўвае беларускую лацінку для транслітарацыі ўласных імёнаў і іншых словаў у сваіх працах.

За гэтую практыку яго часта крытыкавалі некаторыя славісты, якія выступалі за выкарыстанне стандартнай ангельскай транслітарацыі кірылічных тэкстаў. У гэтым пытанні Арнольд выглядае часам больш прынцыповым, чым многія беларусы як эміграцыі, так і Беларусі. Яго можна лічыць моцным сімвалам і эталонам дакладнай беларусацэнтрычнай транслітарацыі.

З адукацыі ён быў славістам-русістам, але выбраў у якасці асноўнага кірунку беларусістыку, каб разбіць каланіяльны след у Брытаніі ў зліцці славістыкі з выключна прэстыжнай русістыкай.

Факт №2. Стаяў ля вытокаў галоўнага беларусазнаўчага часопісу ў Вялікабрытаніі

Арнольд Макмілін супрацоўнічаў і рэдагаваў часопіс *The Journal of Byelorussian Studies* з самага пачатку – з 1965 года. У 1965–1971 гадах быў рэдактарам часопісу.

З замежных беларусістаў менавіта ён напісаў найбольш артыкулаў у гэтае выданне. Ягонае імя фактычна неаддзельнае ад гісторыі брытанскай беларусістыкі другой паловы XX і пачатку XXI стагоддзя.

Факт №3. Напісаў адныя з галоўных англамоўных кніг пра беларускую літаратуру

Арнольд Макмілін – аўтар шэрагу грунтоўных даследаванняў беларускай літаратуры, як эміграцыйнай, так і метрапольнай:

A History of Byelorussian Literature from its Origins to the Present Day (Giessen, 1977);

Belarusian Literature in the 1950s and 1960s. Release and Renewal (Köln–Weimar–Wien, 1999);

Belarusian Literature of the Diaspora (Birmingham, 2002);

Writing in a Cold Climate: Belarusian Literature from the 1970s to the Present Day (2010);

Breaking with Tradition: Belarusian Short Prose in the Early Twenty-First Century (2018).

Арнольд Макмілін быў і застаецца адным з самых вядомых англамоўных акадэмічных беларусістаў і папулярызатараў беларускай літаратуры. Знаўца як беларускай літаратуры і тэкстаў, так і шматлікіх літаратараў, іхных жыццяў і беларускага сацыяльна-палітычнага кантэксту з 1970-х гадоў.

Сябраваў з процьмай беларускіх пісьменнікаў і пісьменніц. Ягонымі ўлюбёнцамі можна лічыць Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Сакрата Яновіча, Яна Чыквіна, Віку Трэнас, Вальжыну Морт, Вольгу Гапееву ды некаторых іншых.

Арнольд ганарыцца тым, што Рыгор Барадулін аднойчы назваў яго “ангельскім беларусам”.

Апроч класічнай літаратуры, жвава цікавіцца і даследуе маладую літаратуру, асобна займаецца беларускай “турэмнай літаратурай” скрозь час: як цяперашняй, так і ў мінулым.

Факт №4. Стаў амбасадарам беларушчыны ў англамоўным свеце

Арнольд Макмілін – даўні сябра Скарынаўкі, Ангельска-беларускага таварыства і айца Аляксандра Надсана, своеасаблівы амбасадар беларушчыны ў англамоўным свеце, як яго называў Янка Запруднік.

На міжнародных навуковых форумах амаль заўсёды цягам дзесяцігоддзяў выступаў з беларускай тэмай і вельмі часта па-беларуску. Разам з Джымам Дынглі яны застаюцца рэдкімі волатамі беларускіх штудыяў у Вялікабрытаніі.

Цікавай была повязь Арнольда Макміліна і айца Аляксандра. Іх злучыла беларусістыка, беларуская мова ці, як жартаваў сам Арнольд, “суўдзельніцтва ў беларускай справе”. Калі ліставанне айца Аляксандра і Арнольда было вельмі тэхнічным, так бы мовіць, “па справе”, то сяброўства іхняе было ўсё ж куды больш змястоўнае і лірычнае.

Апроч усяго шарм ангельскага беларусіста палягае ў ягоным слынным ангельскім гумары і часта зачэпістых каментарах, якія насцярожвалі і нават палохалі непадрыхтаваных да такога гумару людзей.

Выступаючы, Арнольд звычайна агнядыхае гумарам. Так, у адным з інтэрв’ю, запісаным Святланай Курс яшчэ ў 2004 годзе, жартаўлівасць і кплівасць Арнольда былі асабліва кідкімі.

Усім вядома, што ён ніколі не хаваецца ад праўды, кажа як ёсць: “Мы з жонкай – ужо не першай свежасці асятрына, таму нашыя зацікаўленні ціхія: падарожжы ў цёплыя краіны, напрыклад”.

У тым самым інтэрв’ю вельмі проста і сакавіта ён апісаў свайго зяця: “Не алкаш, не хуліган”.

Суха, прасталінейна і не без гумару ён канстатуе, што беларусаў, на жаль, ведаюць у Еўропе “пераважна з дрэнных прычынаў: спачатку Чарнобыль, а потым самі ведаеце хто й што”.

Арнольд – заядлы сабачнік, таму ў разводным пратаколе ягоная першая жонка так і напісала: “Арнольд любіў сабак болей, чым мяне”.

На пытанне “А не спрабавалі стаць пісьменнікам?” ён адказаў, не міргнуўшы: “Гэтае самае простае – стаць кепскім паэтам. Але я так званы прафесар”.

А вось цяпер, напярэдадні дня народзінаў Арнольда, мне прыгадалася, як аднойчы, падаецца, у 2022 годзе, давялося мне сустрэцца з ім у Варшаве на канферэнцыі, арганізаванай кафедрай беларусістыкі.

Пасля канферэнцыі зусім нечакана апынуліся мы ў франкамоўнай кампаніі: усе гаманілі па-французску, Арнольд маўчаў, слухаў, калі-нікалі дадаваў “Oui, oui”, потым нахіліўся да мяне і сказаў:

– Уладзь, добра, што ў нас ёсць беларуская мова, у якой мы можам схавацца ад усіх гэтых замежнікаў!

Мяне не проста ўразіла гэтая Арнольдава жартаўліва-праўдзівая заўвага, але ў чарговы раз запэўніла ў нашых сімпатыях і прыяцельстве, а яшчэ выклікала ўсмешку гонару і подзіву ад такой адданасці беларушчыне ангельскага сябра.

Уладзіслаў Гарбацкі, novychas.online

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

вера

СУСТРЭЧА БЯЛЯЦКАГА З ПАПАМ: ЧАМУ ГЭТА ВАЖНА ДЛЯ БЕЛАРУСІ

27 траўня, пасля агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане папа Леў XIV прыняў лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру, былога палітвязьня Алеся Бяляцкага і яго жонку Наталлю Пінчук.

Пра тое, якое значэнне гэтая сустрэча можа мець для Беларусі, "Радыё Свабода" пагутарыла з прадстаўніцай "Хрысціянскай візіі" Наталляй Васілевіч.

– Як стала магчымай сустрэча Алеся Бяляцкага з папам Львом XIV?

– Вядома, што гэтай сустрэчы чакалі даўно. Сам Алесь Бяляцкі казаў, што да яго даходзіла інфармацыя пра жаданне Папы сустрэцца з ім, але з розных прычын, у тым ліку звязаных са здароўем пантыфіка і іншымі акалічнасцямі, сустрэча адкладалася. Толькі цяпер, у траўні 2026 года, яна стала магчымай. Відавочна, што ў Ватыкане добра ведаюць, хто такі Алесь Бяляцкі. Ён Нобелеўскі лаўрэат, вядомы праваабаронца, чалавек сусветнага маштабу. Таму сама сустрэча выглядае цалкам лагічнай. Не было сакрэтам і тое, пра што Бяляцкі будзе гаварыць з Папам. Больш за трыццаць гадоў ён займаецца праваабарончай дзейнасцю, абаронай чалавечай годнасці, дэмакратычных каштоўнасцяў і правоў беларусаў. Менавіта як праваабаронца ён быў запрошаны ў Ватыкан. Бяляцкі гаварыў найперш пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. Алесь Бяляцкі чарговы раз звярнуў увагу на катастрафічны стан з правамі чалавека ў краіне.

Цікава, што літаральна за некалькі дзён да сустрэчы Папа Леў апублікаваў сваю першую энцыкліку – праграмны дакумент, прысвечаны годнасці чалавечай асобы. У ім гаворыцца пра тое, што чалавек не павінен ператварацца ў механізм ці інструмент і што яго годнасць неабходна абараняць. У пэўным сэнсе гэта супадае з тым, чым усё жыццё займаўся Алесь Бяляцкі. Яго дзейнасць таксама была скіраваная на абарону чалавечай годнасці і фундаментальных правоў чалавека.

– Якім можа быць практычны вынік гэтай сустрэчы?

– Сам факт сустрэчы ўжо мае значэнне. Важна, што ўвага да Беларусі яшчэ раз была прыцягнутая на найвышэйшым узроўні. Беларусь часта застаецца па-за фокусам увагі буйных міжнародных і геапалітычных гульцоў. Таму вельмі важна, каб пра нашу краіну, пра беларускі народ і пра яго праблемы ведалі ў Ватыкане і асабіста папа рымскі.

Таксама важна было данесці чаканні беларускай дэмакратычнай грамадскасці адносна той ролі, якую Святы Пасад мог бы адыграць у пытанні вызвалення палітычных зняволеных і спынення рэпрэсій. Гаворка ідзе не толькі пра пераслед каталіцкага касцёла ці іншых рэлігійных супольнасцяў, але і пра рэпрэсіі супраць усяго беларускага грамадства. Безумоўна, адна сустрэча сама па сабе не зменіць сітуацыю. Але яна стварае дадатковую магчымасць данесці праўду пра Беларусь. Алесь Бяляцкі добра ўмее дакладна і пераканаўча тлумачыць праблемы, з якімі сутыкаюцца беларусы, а таксама тыя маніпуляцыі, якія ўзнікаюць вакол беларускай тэматыкі на міжнародным узроўні. Важна было яшчэ раз падкрэсліць, што беларускі народ не падтрымлівае вайну супраць Украіны. Расійскую агрэсію падтрымлівае рэжым, але не беларускае грамадства. Гэтая пазіцыя таксама павінна гучаць у міжнародных дыскусіях.

Мне здаецца, што сам факт такой сустрэчы сведчыць: у Ватыкане ёсць людзі, якія добра разумеюць беларускую сітуацыю і падтрымліваюць беларускую дэмакратычную супольнасць. Гэта таксама знак таго, што ў Святога Пасаду застаецца цікавасць да беларускай праблематыкі і жаданне ўдзельнічаць у гуманітарных намаганнях. Алесь Бяляцкі не раз узгадваў, наколькі важным для яго быў візіт тагачаснага апостальскага нунцыя ў Беларусі арцыбіскупа Клаўдыя Гуджэроці падчас яго першага зняволення. Ён таксама выказваў перакананне, што Святы Пасад адыграў пэўную ролю ў вызваленні палітычных вязняў у мінулым. Таму ёсць надзея, што гэты дыялог будзе працягвацца і што Ватыкан не забудзе пра Беларусь, працягваючы прыкладаць намаганні дзеля падтрымкі беларускага народа і абароны чалавечай годнасці.

Ганна Соўсь, svaboda.org

Аляксандр Адамковіч: ПАТРЫЯРХ БАРТАЛАМЕЙ ЦУДОЎНА РАЗУМЕЕ СУЧАСНУЮ СІТУАЦЫЮ

Чалавек, які цудоўна разумее сучасную сітуацыю, небяспеку з боку Расіі і з боку Маскоўскага патрыярхату. Так апісаў свае ўражанні ад сустрэчы з Усяленскім Канстанцінопальскім патрыярхам Барталамеем у Вільні 7 чэрвеня старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Алесь Адамковіч.

Ён быў у ліку беларускай грамады, якая сустрэлася з патрыярхам і ўдзельнічала ў літургіі ў храме Святой Тройцы.

Кажа старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Алесь Адамковіч: "Патрыярх не толькі шчыра спачувае вернікам, якія не хочуць быць з Масквой, але і робіць шматлікія крокі дзеля таго, каб дапамагчы гэтым людзям. Найперш – гэта дадзены Томас Украіне. А зараз стварэнне вось гэтага экзархату ў Літве".

Паводле Аляксандра Адамковіча, падчас літургіі гучала і беларуская мова, а таксама патрыярх згадаў у сваім казанні і беларусаў: "Такой прамой падтрымкі не было. У той жа час, падчас казання, прагучалі такія словы, што Канстанцінопальская царква як маці-Царква не пакідае сваіх вернікаў і гатовая прыняць усіх, раскіданых па свеце, хто хоча быць з ёй, хоча быць з Усяленскім Патрыярхам. Але ў пераліку моў, на якіх адбываюцца службы, прагучала, што ёсць і беларуская мова, і беларусы".

Візіт Усяленскага Канстанцінопальскага патрыярха Барталамея ў Вільню ладзіўся ў межах Сусветнага апостальскага кангрэсу міласэрнасці, на які з'ехаліся тысячы пілігрымаў, святароў і валанцёраў больш як з 40 краін свету.

racyja.com

адукацыя

АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ НАВЕДАЎ ІМПРЭЗУ АБ-БА

У часе візіту на Беласточчыну Нобелеўскі лаўрэат міра Алесь Бяляцкі сярод іншага наведаў вечарыну падвядзення вынікаў працы дзяцей і моладзі АБ-БА ў 2025/2026-м навучальным годзе.

Алесь Бяляцкі падзяліўся сваімі ўражаннямі:

– Уражанні вельмі добрыя, станоўчыя. І тое, што я бачу, захаванне беларускай культуры, мовы, то гэтаму яшчэ і ў Беларусі трэба павучыцца, як гэта робіцца тут, бо ініцыятывы, якія робяцца па захаванні мовы, па развіцці беларускай культуры, літаратуры сапраўды вельмі важныя, асабліва ўлічваючы тое, што з Беларусі ніякай дапамогі няма. І самі тутэйшыя беларусы вымушаныя арганізоўвацца і працаваць на захаванне сябе.

Імпрэза АБ-Бы прайшла ў Беластоцкім універсітэцкім цэнтры культуры і навукі. Дзеці паказалі прэм'еру спектакля "Прыгоды Віня-Пыха і яго сяброў", пастаўленага рэжысёрам Бернардам Мацеем Банем, выступіла вакальнае трыа "Баламуткі" і танцавальны гурт "Падляскі вянок" пад кіраўніцтвам Алесі Шарамет. Таксама госці імпрэзы пабачылі асобныя візуальныя падкасты праекта "Гэта МЫ".

racyja.com

"РАТАВАЦЬ ТРЭБА СТУДЭНТАЎ, А НЕ ІМІДЖ": У ЕГУ НЕЗАДАВОЛЕНЫЯ ДЗЕЯННЯМІ КІРАЎНІЦТВА

Сілавікі ў Беларусі правялі ўжо больш за 60 ператрусаў у справе Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, які дзейнічае ў Вільні. Як адзначаюць праваабаронцы, распачатая крымінальная справа за аплату навучання, пачынаючы з 2016 года. З ператорусамі прыходзяць да выпускнікоў, студэнтаў і іхных сваякоў.

Да людзей прыходзяць нават на працу, а некаторым тэлефануюць і просяць прыйсці "на размову".

21 траўня ў інтэрв'ю "Радыё Свабода" рэктар ЕГУ Вілюс Шадаўскас паведаміў, што 100 студэнтаў пакінулі ўніверсітэт пасля прызнання яго ў Беларусі "экстрэмісцкім". Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт пацвердзіў, што будзе праводзіць уступную кампанію, аднак не плануе спецыяльных інфармацыйных захадаў для беларускіх абітурыентаў у сітуацыі пагрозаў ад уладаў Беларусі.

Як паўплываў "экстрэмісцкі" статус на жыццё студэнтаў? Пра гэта расказала студэнта ЕГУ Кацярына Васілёнак, якая вучыцца на магістра права.

Васілёнак: Студэнты насамрэч былі ў даволі вялікай паніцы яшчэ ў верасні, калі атрымалі навіны пра тое, што ЕГУ могуць прызнаць "экстрэмісцкай" арганізацыяй. Але 14 красавіка, калі стала вядома, што ЕГУ ўжо прызналі такой арганізацыяй, студэнты вельмі спалохаліся. Многія пачалі задавацца пытаннямі, ці варта адлічвацца, што будзе з імі й іхнымі бацькамі. Асабліва для мяне як для студэнткі, якая ўжо заканчвае навучанне, і для маёй групы, якая таксама заканчвае, паўстала пытанне: ці завяршаць універсітэт, ці атрымліваць дыплом ЕГУ і як увогуле потым карыстацца гэтым дыпломам тым, хто вяртаецца ў Беларусь.

Што робіць сам універсітэт? Якія дзеянні прадпрымае ў гэтай сітуацыі? Тут Кацярына Васілёнак мае пытанні да кіраўніцтва ВНУ.

Васілёнак: Насамрэч ёсць даволі шмат пытанняў наконт рэакцыі на прызнанне ЕГУ "экстрэмісцкай" арганізацыяй. Яшчэ ў верасні, калі стала вядома, што справу перадалі ў суд для прыняцця такога рашэння, ЕГУ, вядома, рабіў рассылкі сярод студэнтаў, але, на мой погляд, гэтыя рассылкі былі недастатковымі. Напрыклад, адной з рэкамендацый ЕГУ было пры перасячэнні мяжы паведамляць беларускім памежнікам пра тое, што яны з'яўляюцца студэнтамі ЕГУ. Я ж студэнтка права – міжнароднага права і права Еўрапейскага Саюза. Таму мне як чалавеку, які сутыкаўся з беларускім заканадаўствам аб "экстрэмізме", абсалютна зразумела, што гэтага рабіць было нельга, прынамсі да моманту, пакуль у вас пра гэта наўпрост не пытаюцца.

Таксама Кацярына кажа, што пасля прызнання сацыяльных сетак ЕГУ "экстрэмісцкімі" ў леташнім жніўні ўніверсітэт не зрабіў публічнай заявы пра гэта. Была рассылка па электроннай пошце, але праблема ў тым, што ў выпускнікоў адключаюць карпаратыўную пошту, як і ўва ўсіх універсітэтах. Таму гэтае паведамленне, хутчэй за ўсё, не дайшло да выпускнікоў і, імаверна, не дайшло да абітурыентаў. Але ці існуе нейкі эфектыўны спосаб абараніць студэнтаў? Чаго б чакалі яны самі?

Васілёнак: У першую чаргу мне хацелася б, каб ЕГУ разумеў маштаб таго, што адбываецца, і разумеў, што найперш трэба ратаваць студэнтаў, найперш трэба ратаваць тых людзей, якія знаходзяцца ў Беларусі, бо гэта ўжо не пытанне іміджу ўніверсітэта і не пытанне таго, колькі студэнтаў паступіць на новы навучальны год. Гэта пытанне бяспекі і свабоды людзей у Беларусі. На мой погляд, за два месяцы можна было б арганізаваць сустрэчу хаця б з дзейнымі юрыстамі, якія працуюць у межах беларускага заканадаўства аб "экстрэмізме", то бок займаюцца такімі справамі і могуць адказаць на пытанні студэнтаў. Гэта як мінімум можна было зрабіць за гэты час.

Сама Кацярына плануе завяршыць адукацыю ў ЕГУ. Гэта не першы яе "экстрэмісцкі" статус, таму чарговы для яе нічога не мяняе.

Заснаваны ў 1992 годзе ЕГУ пасля закрыцця ў Мінску з 2006 года працуе ў Вільні і застаецца адным з ключавых адукацыйных цэнтраў для беларускіх студэнтаў.

Дзмітры Гурневіч, svaboda.org

Беларускі каляндар памятных дат на ліпень 2026 года

4 ліпеня

• 35 гадоў таму, у 1991-м, у Гродне адкрыўся абласны лялечны тэатр.

5 ліпеня

• 30 гадоў таму, у 1996-м, у Вялікай Бераставіцы адкрыўся раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

6 ліпеня

• 175 гадоў таму, у 1851-м, нарадзіўся Янка Лучына, паэт. Памёр у 1897-м.

• 85 гадоў таму, у 1941-м, савецкім НКУС перад прыходам немцаў, пад Глыбокім расстраляны вязні Берозвецкай турмы (пераважна сяляне).

7 ліпеня

• 230 гадоў таму, у 1796-м, нарадзіўся Ян Чачот, паэт, фальклярыст. Памёр у 1847-м.

10 ліпеня

• 155 гадоў таму, у 1871-м, нарадзіўся Павел Дземідовіч, этнограф. Памёр у 1931-м.

15 ліпеня

• 150 гадоў таму, у 1876-м, нарадзілася Цётка (сапр. Алаіза Пашкевіч, у замужжы Кайрыс), паэтэса, выдавец. Памерла ў 1916-м.

• 100 гадоў таму, у 1926-м, нарадзіўся Ян Садоўскі, скарыназнавец, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Канадзе. Памёр у 1982-м.

16 ліпеня

• 125 гадоў таму, у 1901-м, нарадзіўся Аляксандр Крыт, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША. Памёр у 1983-м.

• 50 гадоў таму, у 1976-м, памёр Янка Станкевіч, мовазнавец, гісторык, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

18 ліпеня

• 80 гадоў таму, у 1946-м, памёр Альбін Ярашэвіч, каталіцкі тэолаг.

20 ліпеня

• 170 гадоў таму, у 1856-м, нарадзіўся Часлаў Пяткевіч, этнограф. Памёр у 1936-м.

21 ліпеня

• 135 гадоў таму, у 1891-м, нарадзіўся Сымон Кандыбовіч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне. Памёр у 1972-м.

23 ліпеня

• 60 гадоў таму, у 1966-м, памёр Аляксандр Ружанцоў, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

24 ліпеня

• 130 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Аляксандр Орса, доктар прыродазнаўства, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр у 1959-м.

25 ліпеня

• 110 гадоў таму, у 1916-м, нарадзіўся Мікалай Каранеўскі, інжынер, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Памёр у 1973-м.

• 20 гадоў таму, у 2006-м, памёр Янка Брыль, народны пісьменнік.

26 ліпеня

• 95 гадоў таму, у 1931-м, памёр Міхаіл Пятроўскі, каталіцкі святар.

31 ліпеня

• 45 гадоў таму, у 1981-м, памёр Міхась Ларчанка, літаратуразнавец.

Беларусы ў свеце
№ 6 (289), чэрвень 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар –
Н. Шыдлоўская,
А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com